## ПЕДАГОГИКА

УДК 94(476)+94(47)

# КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ АСНОВЫ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў ГАЛІНЕ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ДРУГОЙ І ТРЭЦЯЙ ЧВЭРЦЯХ XIX СТАГОДДЗЯ

**С.М. БІТЧАНКА**
***(Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, Мінск)***

*Раскрываюцца канцэптуальныя асновы інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі і выяўляюцца эвалюцыі дзяржаўнай палітыкі Расійскай Імперыі ў дачыненні да ідэалагічнай накіраванасці гістарычнай адукацыі Паўночна-Заходняга краю ў другой і трэцяй чвэрцях XIX стагоддзя. Разглядаюцца канцэпцыі беларускай гісторыі: уніяцкі русінацэнтрызм, тэорыя афіцыйнай народнасці, усходнеславянскі (=беларускі) літвінізм, беларуская нацыянальная самаідэнтыфікацыя, заходнерусізм. Аналізуецца дзяржаўная адукацыйная палітыка ў дачыненні да вучэбна-гістарычнай літаратуры, прызначанай да выкарыстання на ўзроўнях пачатковай і сярэдняй адукацыі. Адлюстраванне гісторыі Беларусі ў тагачаснай вучэбна-гістарычнай літаратуры разглядаецца па крытэрыі гісторыка-ідэалагічнага стаўлення яе аўтараў да прызнання або не прызнання гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларускага народа. Вызначаны канцэпцыі, якія адмаўлялі гістарычнасць і дзяржаваўтваральную суб'ектнасць беларусаў і тыя канцэпцыі, якія яе сцвярджалі.*

***Ключавыя словы:*** *гісторыка-ідэалагічныя канцэпцыі гісторыі Беларусі, дзяржаўная адукацыйная палітыка Расійскай Імперыі, вучэбная літаратура на ўзроўнях пачатковай і сярэдняй адукацыі.*

У другой і трэцяй чвэрцях XIX ст. у Расійскай Імперыі працягваецца фарміраванне гісторыка-ідэалагічных канцэпцый інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі, якія аказвалі ўплыў на развіццё гістарычнай адукацыі. У гэты час адбываецца як эвалюцыя існаваўшых гісторыка-ідэалагічных канцэпцый, так і фарміраванне новых дзяржаўных ідэалагічных установак, якія былі вызначаны ўрадам у сувязі з палітычнымі падзеямі. У пэўнай паслядоўнасці разам з гісторыка-ідэалагічнымі канцэпцыямі адбываліся змены і ў зместавым напаўненні вучэбна-гістарычнай літаратуры. Гісторыка-ідэалагічнай асновай школьных падручнікаў, якія былі дазволены ўрадам для выкарыстання ў адукацыйным працэсе, сталі дзяржаўныя ідэалагічныя ўстаноўкі: тэорыя афіцыйнай народнасці і тэорыя заходнерусізма. Вучэбныя кнігі, створаныя на аснове іншых канцэпцый, не дазваляліся ўладамі, але, нягледзячы на гэта, меў месца факт іх выкарыстання настаўнікамі нелегальна і без узгаднення з чыноўнікамі.

Напрыканцы першай чвэрці XIX стагоддзя выразна заявіла аб сабе група беларускай інтэлігенцыі, якая сваю радзіму "Літву", як адзначае Д.У. Караў, стала разглядаць не як "правінцыю" польскай гісторыі і дзяржаўнасці, а як самабытны край, які мае сваю ўласную гісторыю і культуру [5, с. 159]. У гэты час узнікае ўніяцкае прачытанне традыцыі. Гісторыка-ідэалагічная канцэпцыя ўніяцкага русінацэнтрызму, якая сфарміравалася ў асяроддзі ўніяцкай прафесуры Віленскага ўніверсітэта, выразна вылучала ды падкрэслівала славянскі, "рускі" элемент у ВКЛ. Уніяцкае духавенства, як адзначае Р. Радзік, утварала выразна адасобленую праслойку грамадства, якая мела пачуццё рэгіяналізму, усведамляла сваё "рускае" паходжанне, што адрознівала яго ад каталікоў Польшчы і Жамойці, а таксама ад праваслаўных "маскалёў" [17, с. 218]. Прадстаўнікі ўніяцкай інтэлектуальнай эліты рабілі націск на выключнае значэнне "рускага" элементу ў культуры і дзяржаўных формах жыцця ВКЛ, якія былі, паводле іх меркаванняў, усходнеславянскімі традыцыямі мясцовай Літоўскай Русі. Сярод аўтараў гэтай канцэпцыі вылучаюцца дзеячы так званага "Беларускага акадэмічнага кола" – Міхал Бабpоўскі, Ігнацы Даніловіч, Язэп Ярашэвіч, Платон Сасноўскі, Ігнацы Лабойка, Тэадор Нарбут, Ігнацы Анацэвіч. Яны сталі першымі прафесійнымі гісторыкамі, якія заклалі падмурак канцэпцыі беларускай гісторыі. Іх адукацыйная дзейнасць садзейнічала абуджэнню цікавасці да гістарычнага мінулага сярод студэнцтва. Міхал Бабpоўскі разам з Ігнацы Даніловічам, паводле меркаванняў А. Латышонка, сталі пачынальнікамі і першымі творцамі "беларускага нацыянальнага адраджэння" і "беларускай нацыянальнай ідэі" [11, с. 14].

Віленскі ўніверсітэт у гэты час адыгрываў ролю, як адзначае В.Л. Насевіч, аднаго з "рэактараў" польскага нацыянальнага праекта. Аднак частка выкладчыкаў мела нешляхецкае і некаталіцкае паходжанне, што не дазволіла ім далучыцца да гэтага праекту [15]. Яны з гонарам падкрэслівалі, як адзначае І.А. Марзалюк, культуртрэгерскую ролю ўсходнеславянскага (=рускага) элемента як носьбіта культуры ў справе цывілізаванасці балцкай Літвы, бо менавіта мовай культуры, дзяржавы і права ВКЛ стала мова

"руская". Яны марылі аб вяртанні ў грамадскае жыццё "Северо-Западного края" даўняй мовы Літоўскіх статутаў [13, с. 54]. Ігнацы Даніловіч і Міхал Баброўскі ўслед за польскім навукоўцам Багумілам Ліндэ наўпрост называлі мову летапісаў і статутаў ВКЛ мовай беларускай [13, с. 56]. М. Баброўскі быў першым беларускім даследчыкам, які згадаў у 1826 годзе былую веліч беларускай мовы і культуры. З русінацэнтрычных пазіцый трактаваў гісторыю ВКЛ і прафесар Я. Ярашэвіч. Усе бакі жыцця ВКЛ, паводле Я. Ярашэвіча, развіваліся пад уплывам дзяржаўнасці і права русінаў. І толькі хрышчэнне Літвы паводле каталіцкага абраду спыніла яе пераўтварэнне ў цалкам "рускую" дзяржаву і паставіла бар'ер паміж літоўцамі і русінамі [29, с. 7]. Хрышчэнне літоўцаў у праваслаўную веру прыводзіла да іх асіміляцыі, пераўтварэння ў русінаў [13, с. 56]. Гэта канцэпцыя стала асновай пэўнай часткі вучэбнай літаратуры, якая была створана віленскімі выкладчыкамі і аўтаномна без узгаднення з уладамі выкарыстоўвалася ў адукацыйным працэсе. Сутнасць гэтай канцэпцыі дазваляе вызначыць разуменне аб тым, што гэты гісторыка-ідэалагічны накірунак стаў першым крокам на шляху ўсведамлення і канцэптуальнага афармлення гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларусаў. Такім чынам, беларуская нацыянальная ідэя пачала сваё станаўленне з літвінскай ідэі аб адраджэнні ВКЛ. Паводле А.І. Цвікевіча, гэта быў цікавейшы час у гістарычным жыцці Беларусі, калі "сярод тагачаснай прафэсуры беларускага пахаджэньня зарадзілася думка аб самастойнай прыродзе краіны і аб магчымасьці яе адраджэньня, незалежнага ад Польшчы і Расіі" [27, с. 13]. Працы ўніяцкай прафесуры, як адзначае І.А. Марзалюк, сталі ідэйнымі натхняльнікамі фарміравання заходнерускіх поглядаў і ім папярэднічалі. У сваю чаргу, творчасць беларускіх інтэлектуалаў заходнерускай традыцыі стала асновай ідэйных вытокаў інтэрпрэтацыі гісторыі ВКЛ як гісторыі ўсходнеславянскай (= беларускай) дзяржавы [13, с. 56]. Паводле В.Л. Насевіча, на працягу 1830–40-х гг. выхадцы з уніяцкага духавенства беларускіх губерняў: Віцебскай і Магілёўскай, неаднаразова вызначаюць сябе як "беларусаў" ці "беларусцаў" – але не ў этнічным, а ў рэгіянальным сэнсе [15].

Змяненне ўрадавай палітыкі звязана з уступленнем на трон імператара Мікалая І (1825–1855). Імператар падкрэсліваў: "Пока я существую, я никоимъ образомъ не могу допустить, чтобы идеи о присоединеніи Литвы къ Польшѣ могли быть поощряемы, такъ какъ, по моему убѣжденію, это вещь неосуществимая, и которая могла бы повлечь за собою для Имперіи самыя плачевныя послѣдствія" [4, с. 89]. У дачыненні да "заходніх губерняў" Мікалай І вярнуўся да палітыкі Кацярыны Вялікай: "Вѣсти край сѣй силой возвышенія православія и элементовъ русскихъ къ безпредѣльному единенію съ великорусскими губерніями"…≤…≥… Дотолѣ не перестанутъ дѣйствовать во исполненіе изъясненныхъ видовъ моихъ, пока ввѣренныя вамъ губерніи но сольются съ остальными частями Имперіи въ одно тѣло, въ одну душу" [24]. 4 красавіка 1831 года Мікалай І падпісаў указ: "Относительно воспитанія юношества въ западных губерніяхъ", у якім пастанаўлялася, што "Его Императорское Величество, находя, что способъ нынѣшняго воспитанія юношества въ Бѣлоруссіи и другихъ губерніяхъ, возвращенныхъ отъ Польши, требуетъ неотлагательного преобразованія и совершенствованія" [21, стб. 426]. Імператар патрабаваў, каб "Министерство Народнаго Просвѣщенія, и въ особенности Попечитель Бѣлорусскаго Учебнаго Округа, приложили всевозможное стараніе къ скорѣйшему исполненію имѣющихся предположеній о постепенномъ уничтоженіи духовныхъ училищъ при Римско-Католическихъ монастыряхъ и о преподаваніи на Русскомъ языкѣ наукъ въ долженствующихъ замѣнить оныя свѣтскихъ училищахъ, имѣя постоянною цѣлію – направленіе публичнаго воспитанія къ сближенію тамошнихъ жителей съ природными Россіянами" [21, стб. 426]. У выніку гэтай палітыкі на былых землях "Польско-Литовского королевства" спынілі функцыянаванне духоўныя вучылішчы каталіцкай накіраванасці, выкладанне стала весціся на рускай мове. Выпускнікам Віленскага ўніверсітэта было забаронена выкладаць у мясцовых навучальных установах [21, стб. 426].

У аснову адукацыі была пакладзена "Тэорыя афіцыйнай народнасці", якая вызначыла ідэалагічныя прынцыпы Расійскай манархічнай дзяржавы: "Самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць". Гэты ідэалагічны накірунак, які ўзнік у гады валадарання Мікалая І, упершыню быў агучаны 19 лістапада 1833 года графам С.С. Уваравым, які быў прызначаны на пасаду міністра народнай асветы Расійскай Імперыі: "Народное воспитание должно совершаться в соединенном духе Православия, Самодержавия и Народности" [25, с. 102–103]. Паводле тэорыі, рускі народ з'яўляецца адзіным, ён глыбока рэлігійны і адданы трону, а праваслаўная вера і самадзяржаўе складаюць абавязковыя ўмовы існавання ўсёй Расійскай Імперыі. Агульная сутнасць канцэпцыі зводзілася да таго, што рускі народ і дзяржава з'яўляюцца даволі развітымі, таму ніякіх карэнных зменаў праводзіць не трэба. Неабходна толькі развіваць патрыятызм, узмацняць самадзяржаўе і пазіцыі царквы [25, с. 107]. З гэтага часу беларускія землі сталі трактавацца як "губерніи, отъ Польши возвращенныя" або "западные губернии", хоць раней яны, разам з іншымі тэрыторыямі былой Рэчы Паспалітай, называліся "присоединенными отъ Польши" і не лічыліся спрадвечна расійскімі. Назва "губерніи, отъ Польши возвращенныя" выкарыстоўвалася на працягу другой чвэрці XIX стагоддзя [25, с. 458]. Была ўведзена афіцыйная назва тэрыторыі былога ВКЛ – "Сѣверо-Западный край" [21; 22]. У гэты час сярод губернатараў з беларускіх і ўкраінскіх губерняў пашыралася думка, як сцвярджае А.І. Цвікевіч, што Беларусь разам з Літвой з'яўляецца "дрэўняй Славяніяй", якая "однородна" з "Вялікарасіяй" па мове і веры" [27, с. 15].


ОПЫТЫ
ВЪ РУССКОЙ СЛОВЕСНОСТИ
ВОСПИТАННИКОВЪ
ГИМНАЗІЙ БѢЛОРУССКАГО
УЧЕБНАГО ОКРУГА.
НАПЕЧАТАННЫЕ
ПО ПРИКАЗАНІЮ Г. МИНИСТРА
НАРОДНАГО ПРОСВѢЩЕНІЯ.
ВИЛЬНА,
ВЪ ТИПОГРАФІИ ѲЕОФИЛА ГЛИКСБЕРГА ТИПОГРАФА
БѢЛОРУССКАГО УЧЕБНАГО ОКРУГА.
1839.

**Малюнак 1. – Опыты в русской словесности. Вильна, 1839**

Змена падыходаў да трактоўкі беларускіх губерняў з'явілася асновай і апраўданнем выпрацоўкі ўрадам новай палітыкі ў галіне адукацыі. Урадавыя ідэалагічныя погляды былі пакладзены ў аснову зместавага напаўнення вучэбных праграм, падручнікаў і дапаможнікаў па гісторыі. Сярод прадстаўнікоў педагагічнай супольнасці, якія праз гістарычную адукацыю прапагандавалі і развівалі "тэорыю афіцыйнай народнасці", асабліва вылучаюцца М.П. Пагодзін і М.Г. Устралаў, аўтары падручнікаў для ўстаноў пачатковай і сярэдняй адукацыі. Менавіта М.Г. Устралаў упершыню ўвёў у навуковы дыскурс у дачыненні да ВКЛ тэрмін "Літоўска-руская дзяржава", які з 1839 года пачала выкарыстоўваць пераважная большасць расійскіх дарэвалюцыйных гісторыкаў. Такое разуменне было выкладзена і ў падручніку "Опыты въ русской словесности воспитанниковъ гимназій Бѣлорусскаго учебнаго округа" (малюнак 1), выдадзеным у Вільні (1839): "≤…≥ до вступленія Ягеллы на престолъ Королей Польскихъ въ концѣ XIV столѣтія, вся западная половина отечества нашего, или такъ называемое тогда Великое Княжество Литовское, ни чѣмъ не отличалось отъ областей и Княжествъ на сѣверѣ и востокѣ Россіи. Оно было только подъ властію другой владѣтельной династіи, и хотя называлось не Русскимъ именемъ, но не имѣло въ себѣ ничего чужеземнаго. Племя Литвы, изъ котораго произошли его Государи, составляло самую малѣйшую часть ихъ владѣній" [16, с. 3]. Згодна тэорыі, беларускі народ не з'яўляецца гістарычным і дзяржаваўтваральным суб'ектам. Паводле А.І. Цвікевіча, "тэорыя афіцыйнай народнасці" стала асновай і першым этапам станаўлення гісторыка-ідэалагічнай канцэпцыі заходнерусізму [27, с. 13].

У 30-я гады XIX стагоддзя амаль паралельна з тэорыяй афіцыйнай народнасці фарміруецца гісторыка-ідэалагічная канцэпцыя, якая атрымала назву ўсходнеславянскага (=беларускага) літвінізму. У беларускім інтэлектуальным асяроддзі на аснове эвалюцыі русінацэнтрычнай канцэпцыі пачынае фармавацца новы вобраз Беларусі, узнікненне і станаўленне якога было звязана з новай інтэрпрэтацыяй гісторыі ВКЛ. Менавіта ў гэты час, як адзначае І.А. Марзалюк, узнікаюць радыкальныя варыянты прачытання гісторыі Літвы як гісторыі ўсходнеславянскай дзяржавы – Русі Літоўскай, у якой балцкая Літва нібыта адыгрывала другасную, падпарадкаваную ролю, альбо ўвогуле ніякай ролі ў якасці гістарычнага суб'екта не мела [13, с. 53–59]. Сярод аўтараў, чые погляды істотна паўплывалі на фарміраванне ўсходнеславянскага (=беларускага) літвінізму, вылучаюцца два прадстаўнікі педагагічнай супольнасці з Заходняй Беларусі: Ігнацы Кулакоўскі (1800–1870) і Восіп Сянкоўскі (1800–1858). Гродзенскі педагог Ігнацы Кулакоўскі (1834) падкрэсліваў выключнае значэнне ўсходнеславянскага (=славяна-рускага) элемента "заходніх губерняў" у дзяржаўным жыцці ВКЛ. Беларусь у яго даследаваннях фігуруе пад назвамі "Край", "Западныя губерніі", "Бѣлоруссія". Саміх жа беларусаў аўтар называе "славяно-русами" (малюнак 2).



**Малюнак 2. – Ігнацы Кулакоўскі**

У 1834 годзе Кулакоўскі даслаў у Санкт-Пецярбург на імя міністра народнай асветы графа С.С. Уварава ліст, які меў назву "Записка въ Департаментъ народнаго просвѣщенія о преподаваніи въ училищахъ Бѣлоруссіи Исторіи края и созданіи спеціальныхъ учебниковъ для бѣлорусскаго юношества" [10, с. 1]. Да "запіскі" І. Кулакоўскі дадаў падручнік беларускай гісторыі "Гісторыя Краю", які прызначаўся для народных вучылішч. Аўтар прапанаваў карэнным чынам перагледзець змест выкладання гісторыі і ўнесці змены ў вучэбныя планы і праграмы [2, с. 173]. Для дасягнення гэтай мэты, паводле аўтара, неабходна: "Ясное систематическое изложение в училищах истории Западных губерний под исключительным названием Истории края", а таксама "преподавание языка и литературы славянской" [2, с. 172]. Запіска І. Кулакоўскага, як адзначае У.С. Пасэ, з'яўляецца першай вядомай спробай звярнуць увагу цара на становішча беларусаў [2, с. 416]. У сувязі з яго запіскай былі створаны камісіі, перад якімі,

як падкрэслівае У.С. Пасэ, урадам была вызначана наступная задача: “Кулакоўскага з яго ідэямі забыць і па ўказанні імператара Мікалая I ў аснову вучэбнай праграмы па рускай гісторыі для пачатковых і сярэдніх навучальных установ пакласці дзве галоўныя ўстаноўкі: 1. Прагматычны выклад падзей. 2. Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць”. На першым аркушы запіскі рэзалюцыя: “Господинъ министръ приказалъ: предложить профессору Погодину составленіе руководства къ преподаванію исторіи Западныхъ губерній въ духѣ правительства. 31 октября 1834 г.” [10, л. 1]. У 1855 годзе І. Кулакоўскі прыехаў у Санкт-Пецярбург з надзеяй пераканаць міністра. Аднак ідэі аб рэфармаванні гістарычнай адукацыі не былі падтрыманы, а падручнік па “Гісторыі Краю” не быў уведзены ў адукацыйны працэс. Гадаванец Віленскага ўніверсітэта Восіп Сянкоўскі (1835) сцвярджаў, што існавала не адна, а дзве ўсходнеславянскія дзяржавы – дзве Русі і два рускія народы: Расія – “Расія заняволеная” і Літва – “Расія незалежная”, Русь мангольская і Русь літоўская, дзяржава руская хрысціянская і дзяржава руская паганская [13, с. 53–59]. У навуковай супольнасці пачынае выразна акрэслівацца думка, што вялікая колькасць літоўцаў першапачаткова прыняла праваслаўнае хрышчэнне, асімілявалася і стала “рускімі”, што ўсё жыццё ВКЛ праходзіла ў рускіх дзяржаўных і культурных формах, што большасць знакамітых княжацкіх і магнацкіх родаў Княства першапачаткова вызнавалі праваслаўе, а значыць, былі “рускімі” [13, с. 58]. Толькі пазней, пасля заключэння ўніі з Польшчай, літоўцы былі перахрышчаны па каталіцкаму абраду. Акалічнасць, што ў Вялікім княстве Літоўскім доўгі час дзяржаўнай мовай была “руская” (=беларуская), дазваляла сцвярджаць, што ў “заходніх губернях” быў вельмі моцны “рускі” элемент [26, с. 50]. Сутнасць гэтай канцэпцыі дазваляе вызначыць разуменне аб тым, што гэты гісторыка-ідэалагічны накірунак стаў другім крокам на шляху ўсведамлення і канцэптуальнага афармлення гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб’ектнасці беларусаў.

Палітыка імператара Аляксандра II (1855–1881) у дачыненні да “заходніх губерняў” была больш ліберальнай, чым у Мікалая I. Аднак Аляксандр II лічыў, што Царства Польскае для Расійскай Імперыі з’яўляецца крыніцай праблем. Ён падкрэсліваў, што палякаў можна было б даць самім сабе, калі б можна было разлічваць на іх разважлівасць, якая павінна была заключацца ў адмове ад “Заходняга краю” і дзеянняў, якія могуць пашкодзіць Расійскай Імперыі на міжнароднай арэне [20, с. 181]. У 1860-х гадах паступова адбываюцца эвалюцыйныя змены ў гісторыка-ідэалагічнай накіраванасці вучэбнай літаратуры, дазволенай Вучоным камітэтам да выкарыстання ў народных школах “заходніх губерняў”. У снежні 1862 года ў адукацыйны працэс была ўведзена ў якасці дапаможнай беларуская мова, на дыялектах якой пачалі выдавацца падручнікі. 16 студзеня 1863 г. папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі А.П. Шырынскім-Шыхматавым была зацверджана “Инструкція народнымъ учителямъ” (малюнак 3).



**Малюнак 3. – Аляксандр Шырынскі-Шахматаў**

Паводле інструкцыі, настаўнікі павінны звярнуць асаблівую ўвагу “на распространеніе русской грамотности въ народѣ” і імкнуцца, каб “дѣти научились читать по русски и по славянски отчетливо”. Інструкцыя змяшчала ўказанні па дапаможнаму выкарыстанню беларускай мовы пры тлумачэнні вучэбнага матэрыяла: “При обьясненіи непонятныхъ словъ пользоваться родною рѣчью народа, т. е. бѣлорусскимъ нарѣчіем” [28, с. 239]. Рэдакцыя “Весніка Паўднёва-Заходняй і Заходняй Расіі”, дзе была апублікавана інструкцыя, была салідарна з загадам папячыцеля ў дачыненні дапаможнасці беларускай мовы, але негатыўна ставілася да магчымасці яе шырокага выкарыстання ў адукацыйным працэсе: “Это дѣло – но учить на белорусскомъ жаргонѣ – вольность, которая, слава Богу, до сихъ поръ ещё не взбрѣла на умъ ни одному изъ бѣлорусиновъ” [28, с. 239]. У дачыненні да фарміравання самасвядомасці вучняў інструкцыяй вызначаліся патрабаванні, асновай якіх заставалася тэорыя афіцыйнай народнасці: “Доводить дѣтей до сознанія, что они русскіе, развивать въ нихъ любовь и уваженіе къ православной вере, къ своей русской народности, къ сельскому быту, къ законамъ и къ Царю-Освободителю” [28, с. 241]. Вызначаліся таксама патрабаванні да парадку выкарыстання ў адукацыйным працэсе вучэбнай літаратуры: “Не учить тому, чего не положено, и употреблять руководства, одобренныя начальствомъ учебнаго округа. Если въ книгахъ окажется недостатокъ – писать о томъ въ округъ, съ указаніемъ, какого сочиненія и сколько требуется экземпляровъ” [28, с. 243]. Неабходнасць выкарыстання беларускай мовы адзначалі і іншыя прадстаўнікі педагагічнай супольнасці. У гэтым жа 1863 годзе такая думка была акрэслена В.І. Вадавозавым, які сцвярджаў, што “статьи должны быть не только понятны народу, но какъ по своему содержанію, такъ и по языку прямо выходить изъ его жизни. Мѣстное нарѣчіе

имѣетъ тутъ важное педагогическое значеніе, и по крайней мѣрѣ треть статей должна быть на немъ написана; въ такихъ мѣстностяхъ, гдѣ иноплеменники составляютъ большинство населенія, русскому языку научаются съ трудомъ и только въ высшихъ заведеніяхъ; тутъ, разумѣется, книга для народнаго чтенія невозможна на другомъ языкѣ, кромѣ того, на которомъ говорятъ жители" [19, с. 91].




**Малюнак 4. – Рассказы на белорусском наречии. Вильна, 1863**

Адной са знакавых для беларусаў вучэбных кніг гэтага часу з'яўляецца падручнік "Разсказы на бѣлорусскомъ нарѣчіи" (малюнак 4), зместавае напаўненне якога стала асновай пачатку беларускай нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. У падручніку знайшлі адлюстраванне не толькі "заходнерускія" ідэі, але і выразна прасочвалася патрыятычная накіраванасць, што стала пэўным імкненнем у накірунку ўзнікнення беларускай нацыянальнай ідэі: "Мы сами по соби народ особный – Бѣлоруссы!" [18, с. 28]. Сутнасць гэтай канцэпцыі дазваляе вызначыць разуменне аб тым, што гэты гісторыка-ідэалагічны накірунак стаў трэцім крокам на шляху ўсведамлення і канцэптуальнага афармлення гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларусаў. Самасцвярджэнне ў падручніку, што "мы – не палякі і не рускія, а беларусы", сведчыць аб эвалюцыі самасвядомасці народа: ад беларускай гістарычнай самаідэнтыфікацыі да беларускай нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Аднак дазволеная вучэбна-гістарычная літаратура выкарыстоўвалася вельмі кароткі час. Працэс фарміравання самаідэнтыфікацыі быў прыпынены ў сувязі з паўстаннем 1863 года. Па загаду генерал-губернатара М.М. Мураўёва падручнікі з устаноў адукацыі канфіскавалі, і расійскі падыход да беларусаў рэзка памяняўся [11]. 1863 год быў апошнім годам, калі з'явіліся друкаваныя літаратурныя творы на беларускай мове. Адзначаючы барацьбу за душу беларуса, М.В. Доўнар-Запольскі даў характарыстыку беларускамоўным выданням: "Гэта была агітацыйная літаратура, выпушчаная як паўстаўшымі палякамі, так і іх супернікамі. Абодва бакі як бы спахапіліся ў год паўстання і ўспомнілі пра тое, што імі забыты галоўны элемент краю, карэннае яго насельніцтва, беларускі мужык" [3, с. 448].



**Малюнак 5. – Іван Карнілаў**

Пасля паўстання папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі быў прызначаны Іван Карнілаў (1864–1868) (малюнак 5). Беларускія землі, паводле І.П. Карнілава, гэта "отторженныя отъ Русскаго государства истинно-русскія области" [6, с. 3]. Перад Віленскай вучэбнай акругай была пастаўлена вучэбна-выхаваўчая задача аб неабходнасці бесперапыннага процідзеяння ўсяму, што варожа Рускай дзяржаве і рускім пачаткам. Паспяховасць яе рэалізацыі наўпрост звязвалася з вучэбнай літаратурай па гісторыі. А для гэтага неабходна, каб "русская мысль, русское слово, русская книга производили здѣсь нравственныя завоеванія повсемѣстно" [6, с. 19]. Падручнікі, паводле І.П. Карнілава, павінны былі быць накіраваны на далучэнне беларусаў да думкі пра тое, што яны самы добранадзейны і верны ўраду народ; што Заходні край ёсць рускі, што польскі пачатак змясціўся ў краі гвалтоўна і з'яўляецца яму чужым. Вучэбна-гістарычная літаратура павінна абуджаць у насельніцтве "Заходняга краю" пачуццё адзінства з рускім народам, павагу да рускай адукацыі і фармаваць агульнарускую самасвядомасць: "Мирно и безъ насилій перевоспитывая молодое поколѣніе, умиротворяя его страсти, сближая его съ русскою цивилизацией, возбуждая сочувственныя къ ней отношенія, учебныя заведенія должны незамѣтно способствовать нравственному, и слѣдовательно, окончательному сліянію западнаго населенія съ остальною Россіей" [6, с. 7]. У Вільні, Віцебску, Мазыры ды іншых гарадах пашыралася навуковая і педагагічная літаратурная дзейнасць. Працы настаўнікаў пад наглядам вучэбнай акругі, накіраваныя да вывучэння гісторыі краю, сталі асновай распрацоўкі падручнікаў [6, с. 21]. Для паспяховага распалячвання "западныхъ губерній" і "утвержденія русскаго дѣла въ краѣ" меркавалася абавязкова ўвесці "русскій составъ администрации, первостепенное значеніе православія и русской школы". Усе настаўнікі каталіцкай веры былі звольнены,

а на іх месца, як падкрэсліваў І.П. Карнілаў, прызначаліся выхадцы з Расіі: "въ 1864-м году вѣсь учебно-педагогическій персоналъ духовно и нравственно преобразился и сдѣлался исключительно русскимъ и православнымъ" [7, с. 13]. Адукацыйная палітыка вызначалася строгім наглядам за вучэбнымі праграмамі і зместавым напаўненнем вучэбных кніг. Падручнікі для навучальных устаноў "Сѣверо-Западнаго края", як адзначае С.В. Снапкоўская, "прынцыпова адрозніваліся ад адпаведных кніг для цэнтральных губерняў вялікадзяржаўным тлумачэннем гісторыі краю, вялікай колькасцю апавяданняў па гісторыі праваслаўя на Беларусі" [23, с. 26]. Адной з такіх вучэбных кніг стала "Книга для чтенія въ народныхъ училищахъ Виленскаго учебнаго округа" (1863), накіраваная на фарміраванне вялікарускай самасвядомасці. Кніга для чытання складалася з "разсказовъ изъ русской исторіи".

У 1864 годзе ўрад распачаў адукацыйныя меры, разлічваючы, што асвета ў рускім праваслаўным духу пацягне палітыка-культурную пераарыентацыю беларускага насельніцтва ад Польшчы да Расіі. Паводле І.П. Карнілава, "Русское образованіе есть главнѣйшая сила, способствующая предохраненію края отъ смутъ и потрясения" [6, с. 7]. У Беларусі адкрылася вялікая колькасць пачатковых царкоўна-прыходскіх школ, адукацыйны працэс у якіх меў рэлігійна-русіфікатарскую накіраванасць. Для падрыхтоўкі мясцовых настаўнікаў улады адкрылі некалькі настаўніцкіх семінарый. Міністэрскім цыркулярам ад 8 студзеня 1864 г. "О неиспользованіи въ стѣнахъ учебныхъ заведеній мѣстныхъ языковъ" вучням не дазвалялася размаўляць паміж сабой, з настаўнікамі і чыноўнікамі школьнага ведамства на беларускай мове [23, с. 26]. Усё беларускае ў навучальных установах атаясамлівалася з непісьменнасцю. Паводле меркаванняў М. Мураўёва, неабходна пастаянна ўсім тлумачыць, што Паўночна-Заходні край заўсёды быў і ёсць рускі, а польскі "элемент", які замацаваўся "въ древнемъ православномъ русско-литовскомъ краѣ" у час польскага валадарства, з'яўляецца часовым [7, с. 11]. Улады вызначылі этнічны склад насельніцтва былога ВКЛ: карэнным народам у Ковенскай губерніі лічыліся "жмудины и литовцы", а ў астатніх губернях – "русскіе", пераважна праваслаўнага спавядання. Палякі лічыліся, як адзначаў інспектар Віленскай вучэбнай акругі В.П. Кулін, насельніцтвам "пришлымъ, отъ котораго народъ, кромѣ угнетеній, ничего не видѣлъ, въ особенности, много претерпѣли отъ него православныя со своимъ духовенствомъ" [7, с. 415]. Акрамя палякаў, "переселившихся на русскую землю" ў заходнія губерніі, тут яшчэ ў значна большым ліку пражываюць нашчадкі старажытных "коренныхъ русскихъ родовъ", якія адступіліся ад праваслаўя і рускай народнасці, прынялі лацінства і вызнавалі сябе па самасвядомасці палякамі [7, с. 415]. У гэты час па ўсёй тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай асноўным паказчыкам падзелу насельніцтва па нацыянальнасцях стала рэлігія: кожны праваслаўны – рускі, кожны каталік – паляк. У 1864 годзе беларуская мова была выключана з выкладання. Але цэлы год, як падкрэслівае І.А. Марзалюк, мова афіцыйна выкладалася ў школе, а беларусы вучылі гісторыю на роднай мове па падручніку, у якім сцвярджалася, што ў мінулым у іх была свая дзяржаўнасць у выглядзе Полацкага княства, што ў ВКЛ панавалі іх культура і мова. Падкрэслівалася, што і каталікі, і праваслаўныя – гэта беларусы, а не палякі ці іншы народ [12, с. 375].

29 красавіка 1864 года пачала дзейнасць Віленская археаграфічная камісія, перад якой ставіліся, як адзначаў яе старшыня П. Кукальнік, наступныя палітычныя задачы: а) фактычна даказаць, што Заходні край ніколі не быў шчаслівы пад польскім урадам; б) што цывілізацыя Польшчы, а з ёю і Заходняга краю далёка адставала ад той ступені дасканаласці, на якую ставілі яе палякі; в) што толькі пад рускім урадам Заходні край забыў свае пакуты, загаіў ранейшыя раны і пачаў сваё гісторыка-палітычнае існаванне [1, с. 24]. Разам з выданнямі камісіі ў навуковым асяроддзі пашыраецца інтэрпрэтацыя, што Літва (= ВКЛ) – гэта Паўночна-Заходняя Русь, а Масква (= ВКМ) – Русь Усходняя. Такія канцэптуальныя погляды на беларускае гістарычнае мінулае сталі амаль хрэстаматыйнымі і знайшлі сваё адлюстраванне не толькі ў навуковых, але і ў вучэбных выданнях па заходнерускай (= беларускай) гісторыі для ўстаноў адукацыі, якія выдаваліся ў Вільні і былі дазволены ўладамі. З гэтага часу асновай зместавага напаўнення вучэбна-гістарычнай літаратуры становіцца гісторыка-ідэалагічная канцэпцыя заходнерусізму. Гэты накірунак грамадска-палітычнай думкі грунтаваўся, як адзначае В.Л. Насевіч, на пастулаце, што беларусы з'яўляюцца самабытнай этнаграфічнай групай агульнарускага народа [13]. Сцвярджалася, як падкрэслівае А.І. Цвікевіч, што Беларусь – гэта "Заходняя Расія", якая непадзельна звязана з адзінай Вялікай Расіяй, а беларусы – гэта адно са славянскіх плямёнаў, якое арганічна ўваходзіць у склад трыадзінага рускага народа [27, с. 7]. У заканадаўчых актах часоў Аляксандра ІІ усходнеславянскія тэрыторыі ВКЛ згадваюцца як "Сѣверо-Западный край" або "Западный край" і ўсведамляліся як "древній православный русско-литовскій край".

Вучоны камітэт усведамляў, што гісторыя як вучэбная дысцыпліна з'яўляецца адным з асноўных фактараў, якія могуць уплываць на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці грамадзяніна Расійскай Імперыі. Таму гэтай вучэбнай дысцыпліне надавалася асаблівае значэнне як сярод расійскіх чыноўнікаў, так і сярод прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі. З мэтай абвяржэння польскіх прэтэнзій на Беларусь і Літву, царскі ўрад пачаў даказваць рускі характар Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі. У гэтай сувязі афармляецца і атрымлівае развіццё варыянт прачытання гісторыі ВКЛ праз усведамленне

самабытнасці Беларусі як “Заходняй Русі (Расіі)”. Тэарэтычнае абгрунтаванне канцэпцыі заходнерусізму было дадзена Міхаілам Каяловічам у навуковых працах “Гісторыя рускай самасвядомасці” і “Лекцыі па гісторыі Заходняй Расіі”, якія былі ўключаны ў вучэбную праграму настаўніцкіх семінарый. М.В. Каяловіч ідэнтыфікаваў беларускасць з праваслаўем і негатыўна ставіўся да польскага ідэалагічнага ўплыву на насельніцтва “заходніх губерній”. Беларускі патрыятызм тлумачыўся выключна праз прызму непарыўнага адзінства з Расіяй [8, с. 220]. Заходнерускае тлумачэнне беларускай гісторыі знайшло адлюстраванне і ў падручніку Ульяна Крачкоўскага “Очерки изъ русской исторіи” (малюнак 6), які быў выдадзены ў Вільні (1869): “Кромѣ одного названія – всё остальное здѣсь было Русское. При такомъ соприкосновеніи, сами Литовцы стали теперь дѣлаться Русскими” [9, с. 143]. Станаўленне канцэпцыі заходнерусізма, паводле А.І. Цвікевіча, адбывалася з прычыны “барацьбы з пальшчызнай у заходніх губернях” [27, с. 14]. Канцэпцыя заходнерусізма стала антытэзай паланізуючым сілам, якія ішлі на Беларусь з захаду і намагаліся тэорыяй і практыкай давесці, што “Беларусь ёсьць часьць Польшчы і што беларуская народная культура ёсьць сваяадменная польская культура”. Заходнерусізм, паводле А.І. Цвікевіча, змагаўся супраць гэтай тэндэнцыі, але ў інтарэсах не Беларусі, а ў інтарэсах “Вялікае Расіі” [27, с. 15]. Культурная гісторыя Беларусі стала “выражэньнем узаемнае барацьбы русыфікацыйных і полёнізуючых начал за гегемонію ў Беларусі” [27, с. 15].




**Малюнак 6. – Очерки из русской истории. Вильна, 1869**

Выніковым этапам развіцця гэтай плыні сталі 1860–70-я гады XIX стагоддзя, што было выклікана паўстаннем К. Каліноўскага і русіфікатарскай палітыкай М. Мураўёва. У гэты час заходнерусізм набыў сваё ўласнае імя і падвёў пад сваю палітычную праграму “нібыта навуковы фундамант” [27, с. 16]. Паводле А.І. Цвікевіча, “заходнерусізм” стаў велізарнай палітычнай сілай, якая затрымлівала развіццё беларускага культурнага адраджэння і запаволіла фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі” [27, с. 16]. Але менавіта ў заходнерускім асяроддзі, як адзначае І.А. Марзалюк, паспелі найважнейшыя перадумовы для інстытуалізацыі беларускай нацыянальнай тоеснасці ў будучым. Заходнерускія ідэі сталі вытокамі ў станаўленні нацыянальнай канцэпцыі беларускай гісторыі перыяду нацыянальнага адраджэння і абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Прадстаўнікі гэтай гісторыка-ідэалагічнай канцэпцыі імкнуліся супрацьпаставіць нібыта “славянскую”, “беларускую” Літву і літвінаў – балцкай “Летуве” і “летувісам”. “Заходнерусізм” узнік у абставінах змагання “рускага царызму з рэшткамі дзяржаўнай самастойнасьці ВКЛ” [27, с. 347]. Асноўны пастулат палягаў на непрызнанні самастойнасці беларускага народа. У сферы практычнай дзейнасці ён зводзіўся да барацьбы з “лацінствам”, з польскім уплывам [27, с. 347]. Паводле канцэпцыі, беларускі народ не з’яўляецца гістарычным і дзяржаваўтваральным суб’ектам. Далейшае развіццё заходнерусізму адбывалася падчас валадарання Аляксандра III і Мікалая II і без значных перапынкаў дайшло да часу Першай Сусветнай вайны.

За акрэслены перыяд з 1825 па 1875 гг. можна зафіксаваць эвалюцыю дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да ідэалагічнай накіраванасці гістарычнай адукацыі Расійскай Імперыі. У гэты час у пэўнай паслядоўнасці ўзнікаюць, атрымліваюць развіццё і пачынаюць паралельна суіснаваць наступныя канцэпцыі: уніяцкі русінацэнтрызм (1826–1917), тэорыя афіцыйнай народнасці (першы этап фарміравання заходнерусізму) (1833–1917), усходнеславянскі (=беларускі) літвінізм (1834–1917), першая ідэя беларускай нацыянальнай самаідэнтыфікацыі (1862–1917), заходнерусізм (1864–1917). Аналіз гісторыка-ідэалагічных канцэпцый па крытэрыі стаўлення да беларускага гістарычнага мінулага дазваляе падзяліць іх на дзве групы: 1. Канцэпцыі, якія адмаўлялі гістарычнасць і дзяржаваўтваральную суб’ектнасць беларускага народа: тэорыя афіцыйнай народнасці, заходнерусізм (у папярэдні ім час узніклі канцэпцыі: паланалітвінізм, русінацэнтрызм, балцкі (=літоўскі) літвінізм). 2. Канцэпцыі, якія сталі пэўнымі гістарычнымі крокамі да ўсведамлення беларускай гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб’ектнасці, вынікам чаго стала фарміраванне канцэпцыі нацыянальнай гісторыі Беларусі: уніяцкі русінацэнтрызм, усходнеславянскі (=беларускі) літвінізм, беларуская нацыянальная ідэя.

Такім чынам, у другой і трэцяй чвэрцях XIX стагоддзя разам са зменай гісторыка-ідэалагічных асноў адукацыйнай палітыкі паступова адбываецца эвалюцыя вобраза гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні падручнікаў, падрыхтаваных для выкарыстання ў адукацыйным працэсе ва ўстановах

пачатковай і сярэдняй адукацыі "заходніх губерняў" Расійскай Імперыі. Адлюстраванне гісторыі Беларусі ў тагачаснай вучэбна-гістарычнай літаратуры грунтавалася на гісторыка-ідэалагічным стаўленні яе аўтараў да прызнання або не прызнання гістарычнай і дзяржаваўтваральнай суб'ектнасці беларускага народа. Гістарычная і дзяржаваўтваральная суб'ектнасць беларусаў мела сваёй сутнасцю сцвярджэнне або адмаўленне таго, што беларускі народ на працягу сваёй гісторыі сам вызначаў свой лёс і быў аднаасобным стваральнікам уласнай дзяржавы Полацкага Княства (Полацкай Русі), а таксама стваральнікам або раўнапраўным сустваральнікам разам з літоўцамі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага – сумеснай дзяржавы двух народаў. Супрацьлеглы ж погляд сцвярджаў, што Полацкае Княства было часткай Кіеўскай Русі і не мела самастойнасці, а ВКЛ – гэта літоўская (=балцкая) дзяржава, якая падначаліла і падпарадкавала беларускі народ.

ЛІТАРАТУРА


1. Акты, издаваемые Комиссиею, высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне. – Т. 1. – Вильна : Тип. А.К. Киркора, 1865. – 378 с.
2. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. Э.К. Дорошевич, М.С. Мятельский, П.С. Солнцев. – М. : Педагогика, 1986. – 468 с.
3. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский. – 2-е изд. – Минск : Беларусь, 2005. – 680 с.
4. Зайончковский, А.М. Восточная война 1853–1856 гг. в связи с современной ей политической обстановкой / А.М. Зайончковский. – СПб. : Экспедиция заготовл. государств. бумаг, 1908. – Т. 1. – 763 с.
5. Карев, Д.В. Белорусская и украинская историография конца XVIII – начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д.В. Карев. – Вильнюс : ЕГУ, 2007. – 312 с.
6. Корнилов, И. Общие замечания о положении учебно-воспитательного дела в Виленском учебном округе в 1867 г. / И. Корнилов // Журнал М-ва народ. просвещения. – 1868. – № 7. – С. 1–27.
7. Корнилов, И. Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы для истории Виленского учебного округа преимущественнно в Муравьевскую эпоху / И. Корнилов. – СПб. : Тип. А. Лопухина, 1901. – 420 с.
8. Коялович, М.О. Чтения по истории западной России / М.О. Коялович. – СПб. : Тип. А.С. Суворина, 1884. – 349 с.
9. Крачковский, Ю. Очерки из русской истории / Ю. Крачковский. – Вып 1. – Вильна, 1869. – 256 с.
10. Кулаковский, И.Г. История Края / И.Г. Кулаковский // Центральный государственный исторический архив (ЦГИА СПб.). – Ф. 733. Оп. 66. Д. 172. Л. 1–130.
11. Латышонак, А. Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі / А. Латышонак // Спадчына. – 1992. – №1.– С. 9–14.
12. Марзалюк, И.А. Самобытное национальное лицо Беларуси: о смыслах и кодах белорусской культурной традиции И.А. Марзалюк // Глобальный мир: системные сдвиги, вызовы и контуры будущего : XVII Междунар. Лихачевские науч. чтения, 18–20 мая 2017 г. – СПб. : СПбГУП, 2017. – С. 373–375.
13. Марзалюк, І.А. Вытокі беларускага заходнерусізму і літвінізму / І.А. Марзалюк // Беларус. думка. – 2012. – № 8. – С. 53–59.
14. Носевич, В.Л. Белорусы: становление этноса и «национальная идея» / В.Л. Носевич // Белоруссия и Россия: общества и государства. – М. : Права человека, 1998. – С. 11–30.
15. Носевич, В.Л. Истоки белорусской идентичности [Электронный ресурс] / В.Л. Носевич // Studia Slavica et Balcanica Petropolitana. – Режим доступа: http://vln.by/node/259. – Дата доступа: 26.02.2020.
16. Опыты в русской словесности воспитанников гимназий Белорусского учебного округа. – Вильна : Тип. Ф. Гликсберга, 1839. – 530 с.
17. Радзік, Р. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX –XX ст. / Р. Радзік // Беларускі гістарычны агляд / навук. рэд. Г. Сагановіч. – Т. 2. – Сш. 2. – Мінск : Рэд. БГА, 1995. – С. 195–229.
18. Рассказы на белорусском наречии. – Вильно : Тип. А. Сыркина, 1863. – 36 с.
19. Рецензия Ученого комитета Министерства народного просвещения на учебное пособие «Книга для чтения в народных училищах Виленского учебного округа» // Журнал М-ва народ. просвещения. – 1863. – № 5. – С. 90–101.
20. Санкт-Петербургские ведомости. – 19 февр. 1855. – № 38.
21. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения. Т. 2 : Царствование императора Николая I. 1825–1855 гг. Отделеніе 1-е : 1825–1839 [год]. – 2-е изд. – СПб. : Тип. Императ. академии наук. – 1864. – 665 с.
22. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения. Т. 2 : Царствование императора Николая I. 1825–1855 гг. Отделение 2-е : 1840–1855 [год]. – 2-е изд. – СПб. : Тип. Императ. академии наук. – 1864. – 810 с.
23. Снапкоўская, С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гг. XIX – пачатак XX ст.) : вучэб. дапам. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / С.В. Снапкоўская. – Мінск : НІА, 2001. – 160 с.
24. Столыпин, П.А. Нам нужна великая Россия / П.А. Столыпин // Полное собрание речей в Государственной думе и Государственном совете (1906–1911). – М. : Молодая гвардия, 1991. – 416 с.
25. Уваров, С.С. Государственные основы / сост., предисл. и коммент. В.Б. Трофимовой ; отв. ред. О.А. Платонов. – М. : Ин-т рус. цивилизации, 2014. – 608 с.
26. Улащик, Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик. – М. : Наука, 1973. – 303 с.
27. Цьвікевіч, А. «Западно-руссизм»: нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – 2-е выд. – Мінск :Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

28. Ширинский-Шихматов, А.П. Инструкция народным учителям / А.П. Ширинский-Шихматов // Вестн. Юго-Западной и Западной России. – 1863. – Год 1. – Т. 3. – Февр. – С. 239–243.
29. Jaroszewicz, J. Obraz Litwy pod względem jej cywilizacji, od czasów najdawniejszych do końca wieku XVIII. Cz. 2. Litwa w pierwszych trzech wiekach po przyjęciu wiary chrześciańskiej / J. Jaroszewicz. – Wilno : w drukarni M. Romma, 1844. – 313 с.

*Паступіў 02.10.2020*

## CONCEPTUAL BASES OF INTERPRETATION OF THE HISTORY OF BELARUS AND STATE POLICY OF THE RUSSIAN EMPIRE IN THE FIELD OF HISTORICAL EDUCATION IN THE SECOND AND THIRD QUARTERS OF THE XIX CENTURY

***S. BITCHANKA***

*The article is devoted to the conceptual foundations of the interpretation of Belarusian history and evolution of state policy of the Russian Empire against the ideological orientation of history education and educational and historical literature of the Northwest territory in the second and third quarters of the nineteenth century. Historical concepts of Belarusian history are considered: Uniate rusinocentrism, theory of official nationality, East Slavic (=Belarusian) litvinism, Belarusian national identity, West rusism. The article analyzes the state educational policy of the Russian Empire in relation to educational and historical literature intended for use at the levels of primary and secondary education. The reflection of the history of Belarus in the educational and historical literature of that time is considered by the criterion of the historical and ideological attitude of its authors to the recognition or non-recognition of the historical and state-forming subjectivity of the Belarusian people. The concepts that denied the historicity and state-forming subjectivity of Belarusians and those that claimed it were revealed.*

***Keywords:*** *historical and ideological concepts of the history of Belarus, state educational policy of the Russian Empire, educational literature at the levels of primary and secondary education.*